ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
03.08.2023 № 230

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў
«Абагульняючы факультатыўны курс па гісторыі Беларусі»
для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Абагульняючы факультатыўны курс па гісторыі Беларусі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для X–XI класаў ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 138 гадзін пры вывучэнні у X–XI класах (2 гадзіны на тыдзень на працягу двух гадоў, з іх 4 гадзіны – рэзервовыя).

3. Мэта – паўтарэнне, абагульненне, сістэматызацыя ведаў, атрыманых пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі», падрыхтоўка вучняў да выніковай атэстацыі за перыяд навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама да ўступных іспытаў ва ўстановы вышэйшай адукацыі.

4. Задачы:

фарміраванне ў вучняў дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі, прадстаўленага наступнымі спосабамі дзейнасці: уменне суадносіць адпаведныя з'явы і працэсы айчыннай і сусветнай гісторыі навейшага часу, у прыватнасці савецкай і агульнаеўрапейскай;

уменне характарызаваць сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Беларусі;

уменне ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і дзеячаў культуры; уменне тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, з'явамі і працэсамі;

уменне адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэпрэтацыі;

уменне канкрэтызаваць з дапамогай дакументаў і матэрыялаў тэарэтычныя высновы і паняцці;

уменне тлумачыць розныя пункты гледжання на гістарычныя падзеі, прадстаўленыя ў дакументах.

5. Змест дадзенай вучэбнай праграмы складаецца з сямі частак, якія раскрываюць асноўныя падзеі гісторыі Беларусі ў храналагічным парадку:

I. Беларускія землі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.;

II. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII – першай палове XVI ст.;

III. Беларускія землі ў другой палове XVI–XVIII ст.;

IV. Беларускія землі ў XIX – пачатку XX ст.;

V. Беларусь у 1917–1945 гг.;

VI. БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.;

VII. Рэспубліка Беларусь у 1991 г. – пачатку XXI ст.

6. Рэкамендуемыя формы і метады навучання прадугледжваюць арганізацыю ў максімальнай ступені самастойнай практыка-арыентаванай дзейнасці вучняў па засваенні вучэбнага зместу праз фарміраванне адпаведных уменняў, звязаных з арыентацыяй у вучэбным інфармацыйным асяроддзі: вучнёўскае даследаванне ў выглядзе праекта ці рэферата з выкарыстаннем комплексу гістарычных крыніц, удзел у дыскусіях, правядзенне экскурсій, наведванне музееў і іншыя.

7. Вучні, якія засвоілі змест дадзенай вучэбнай праграмы, павінны:

7.1. ведаць асаблівасці развіцця Беларусі на розных гістарычных этапах;

7.2. умець:

суадносіць гістарычныя з’явы і працэсы гісторыі Беларусі з адпаведнымі з’явамі і працэсамі агульнаеўрапейскай гісторыі;

характарызаваць і ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;

сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты, рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы;

выкарыстоўваць змест гістарычнай карты;

параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;

канкрэтызаваць тэарэтычныя высновы і змест гістарычных паняццяў.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### X клас
(70 гадзін, з іх 2 гадзіны – рэзервовыя)

### I. Беларускія землі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.
(18 гадзін)

Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі ў эпоху каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў. Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі. Заняткі і промыслы старажытных жыхароў. Спажывецкая гаспадарка. Супольнасці людзей каменнага веку. Пранікненне на тэрыторыю Беларусі індаеўрапейскіх плямён. Узнікненне жывёлагадоўлі і земляробства. Пераход ад спажывецкай да вытворчай гаспадаркі. Роля металаў у жыцці старажытных людзей. Узрастанне ролі мужчынскай працы. Узнікненне маёмаснай няроўнасці. Уяўленні старажытных людзей аб навакольным асяроддзі. Развіццё старажытнага мастацтва.

Насельніцтва беларускіх зямель у V – канцы IX ст. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі. Славянізацыя балцкага насельніцтва. Аб’яднанні ўсходніх славян на беларускіх землях: крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы. Усходнеславянская (старажытнаруская) супольнасць. Грамадскі лад усходніх славян. Утварэнне суседскай (сельскай) абшчыны. Язычніцкія вераванні і абрады.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст. Гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян. Расслаенне грамадства. Даніна і палюддзе. Складванне феадальных адносін. Узнікненне і рост гарадоў. Рамесная вытворчасць і гандаль. Роля гарадоў у грамадскім жыцці.

Дзяржаўнасць усходніх славян. Княствы на тэрыторыі Беларусі. Старажытнаруская дзяржава ўсходніх славян. Полацкае княства ў IX–XI стст. Узаемаадносіны Полацка з Ноўгарадам і Кіевам. Полацкая княжацкая дынастыя. Князь Усяслаў Брачыславіч. Раздробленасць Полацкай зямлі ў XII – сярэдзіне XIII ст., прычыны і вынікі. Княжацка-вечавы лад. Улада князя і яго абавязкі. Роля веча ў грамадскім жыцці. Тураўскае княства. Берасцейская зямля і Пасожжа.

Прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства. Культура беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст. Прычыны прыняцця хрысціянства. Язычніцтва і хрысціянства. Значэнне прыняцця хрысціянства для ўсходніх славян. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі. Пісьменнасць. Рукапісныя кнігі. Царкоўнае і абарончае дойлідства. Фрэскі. Помнікі прыкладнога мастацтва.

Практыкум.

Падагульненне.

## II. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII – першай палове XVI ст.
## (23 гадзіны)

Палітычная сітуацыя на беларускіх землях сярэдзіны XIII ст. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Пагроза з боку нямецкіх феадалаў-крыжакоў і ардынцаў. Барацьба са знешняй небяспекай. Знешнепалітычныя ўмовы ўзнікнення ВКЛ. Сацыяльна-эканамічныя прычыны ўтварэння ВКЛ. Узвышэнне Наваградскага княства. Каранацыя Міндоўга ў Наваградку. Усходнеславянскі этнічны фундамент ВКЛ.

Унутрыпалітычнае становішча і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIII – 70-я гг. XIV ст. Умацаванне ўлады вялікіх князёў літоўскіх. Княжэнне Гедыміна. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ пры Альгердзе. Адносіны з Тэўтонскім Ордэнам, Залатой Ардой, Маскоўскім княствам. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ.

ВКЛ ў канцы XIV–XV ст.: унутраная і знешняя палітыка. Альгерд і Кейстут. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне. Узрастанне знешняй небяспекі. Крэўская унія. Грунвальдская бітва: вынікі і гістарычнае значэнне. Унутрыпалітычныя супярэчнасці паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам. Абранне Казіміра Ягайлавіча вялікім князем і яго палітыка.

Палітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст. Праўленне Аляксандра і Жыгімонта I Старога. Пашырэнне правоў паноў-рады. Страта ВКЛ першынства ў збіранні «рускіх» зямель. Адносіны з Маскоўскім вялікім княствам. Абарона ад набегаў крымскіх татар. Выступленне М. Глінскага. Супярэчнасці паміж магнатамі і шляхтай.

Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Вышэйшыя органы ўлады і дзяржаўнага кіравання. Вялікі князь. Рада і сойм. Абмежаванне ўлады вялікага князя і павышэнне ролі магнатаў у кіраванні дзяржавай. Сістэма мясцовых органаў кіравання. Войска. Заканадаўства ВКЛ. Статуты ВКЛ.

Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст. Стан сельскай гаспадаркі. Землеўладанне і землекарыстанне. Павіннасці сялян. Этапы запрыгоньвання сялянства. Судзебнік Казіміра. Гарады і мястэчкі. Магдэбургскае права. Рамяство і гандаль. Саслоўная структура грамадства ў ВКЛ.

Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVI ст. Абарончае дойлідства. Культавыя пабудовы. Жывапіс і скульптура. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Пачатак беларуска-літоўскага летапісання. Рэнесансавая культура ў Беларусі. З’яўленне новалацінскай паэзіі (М. Гусоўскі). Францыск Скарына – усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік. Погляды Ф. Скарыны і яго друкарская дзейнасць.

Фарміраванне беларускай народнасці. Шматэтнічны характар ВКЛ. Асаблівасці фарміравання беларускага этнасу. Рэлігійная талерантнасць. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі. Паходжанне назвы «Белая Русь».

Практыкум.

Падагульненне.

## III. Беларускія землі ў другой палове XVI–XVIII ст.
## (24 гадзіны)

Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай. Унутры- і знешнепалітычныя прычыны аб’яднання ВКЛ з Польшчай. Пачатак Лівонскай вайны. Люблінскі сойм. Умовы аб’яднання ВКЛ з Каралеўствам Польскім. Далучэнне да Польшчы часткі зямель ВКЛ. Распрацоўка і прыняцце Статута 1588 г. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Утварэнне Галоўнага трыбунала. Паланізацыя шляхты ВКЛ.

Сельская гаспадарка і гарадское жыццё на беларускіх землях у другой палове XVI–XVII ст. Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку. Аграрная рэформа 1557 г. Станаўленне фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Феадальнае землеўладанне. Феадальныя павіннасці сялян. Запрыгоньванне сялянства. Сацыяльныя супярэчнасці ў вёсцы. Стан гарадоў і іх гандлёвыя сувязі. Юрыдыкі. Мястэчкі. Цэхі.

Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI – першай палове XVII ст. Канфесійнае становішча ў ВКЛ. Рэлігійная верацярпімасць. Традыцыйнае хрысціянства: праваслаўе і каталіцызм. Крызіс праваслаўнай царквы. Перадумовы рэфармацыйнага руху. Асаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях. Дзеячы Рэфармацыі: Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. Контррэфармацыя. П. Скарга. Дзейнасць Ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. Уніяцкая царква.

Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у канцы XVI – першай палове XVII ст. Завяршэнне Лівонскай вайны. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага міру (1582 г.). Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір’е (1618 г.). Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст. Нарастанне турэцкай пагрозы.

Беларусь у час войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг.: прычыны і характар вайны. Казацкія загоны ў Беларусі. Вынікі антыфеадальнай барацьбы. Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг. Прычыны вайны. Палітыка самадзяржаўя на беларускіх землях. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Вынікі вайны для беларускіх зямель. Паўночная вайна 1700–1721 гг. і яе вынікі для Беларусі. Бітва каля вёскі Лясная.

Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў XVIII ст. Сацыяльна-прававое становішча сялянства. Павіннасці сялян і іх юрыдычнае становішча. Сялянскія паўстанні. Гарады і мястэчкі Беларусі. Самакіраванне. Рамесная і мануфактурная вытворчасць. Гандлёвыя сувязі.

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Барацьба магнацкіх груповак. Паслабленне цэнтральнай улады і шляхецкая анархія. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Падзелы Рэчы Паспалітай. Спробы рэформаў. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі: прычыны, характар, вынікі. Я. Ясінскі, М. Клеафас Агінскі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Культура Беларусі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. Кнігадрукаванне. Літаратура. Сістэма адукацыі. Езуіцкая школа. Праваслаўныя брацтвы. Палацава-замкавае будаўніцтва. Стыль барока ў архітэктуры. Партрэтны жывапіс. Іканапіс. Батлейка.

Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст. Уплыў Асветніцтва. Стан асветы. Адукацыйныя ўстановы. А. Нарушэвіч. М. Пачобут-Адляніцкі. Кнігадрукаванне. Літаратура. Палацава-замкавае будаўніцтва. Прыгонны тэатр. Дзейнасць беларускіх майстроў-рамеснікаў. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Вырабы мануфактур.

Практыкум.

Падагульненне.

Праектная дзейнасць (3 гадзіны).

## XI клас
(68 гадзін, з іх 2 гадзіны – рэзервовыя)

### IV. Беларусь у XIX – пачатку XX ст.
(18 гадзін)

Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель. Сацыяльная і канфесійная палітыка расійскага ўрада: абмежавальныя законы ў адносінах да яўрэяў, абмежаванне ўплыву каталіцкага духавенства і ліквідацыя уніяцкай царквы. Беларусь у час вайны 1812 г. Спробы аднаўлення ВКЛ. Вынікі вайны для Беларусі. Стварэнне і дзейнасць тайных арганізацый у Беларусі. Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі. Уплыў паўстання 1830–1831 гг. на грамадска-палітычны рух у Беларусі. Змяненні ў палітыцы самадзяржаўя пасля паўстання.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст. Землеўладанне і памешчыцкая гаспадарка. Становішча сялян і іх павіннасці. Крызіс

феадальна-прыгонніцкай сістэмы гаспадарання. Рэформа П. Дз. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Інвентарная рэформа. Развіццё прамысловасці. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў.

Культура Беларусі ў першай палове XIX ст. Змены ў сістэме адукацыі. Тыпы школ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Станаўленне навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Літаратура. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Тэатр. Музыка. Жывапіс. Архітэктура. Дзеячы культуры (Я. Чачот, К. і Я. Тышкевічы, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч, П. Багрым, І. Хруцкі, В. Ваньковіч, С. Манюшка).

Адмена прыгоннага права. Асаблівасці буржуазных рэформаў другой паловы XIX ст. у Беларусі. Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г., асаблівасці іх прымянення ў Беларусі. Рэакцыя сялянства. Уплыў паўстання 1863–1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г. Асаблівасці судовай і гарадской рэформаў. Рост буржуазнага землеўладання і асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Захаванне адпрацовачнай сістэмы гаспадаркі.

Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. у Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. «Белая» і «чырвоная» плыні ў паўстанні. Праграма К. Каліноўскага. Вынікі паўстання для Беларусі. Рэвалюцыйныя народнікі. Група «Гоман». Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. I з’езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ).

Развіцце капіталізму ў прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці і яе асноўныя галіны. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Змены ў складзе гарадскога насельніцтва. Асаблівасці ў фарміраванні пралетарыяту і буржуазіі ў Беларусі. Развіццё гандлю. Будаўніцтва чыгунак. Станаўленне банкаў. Сталыпінскія рэформы: прычыны і мэты правядзення. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую частку Расіі. Становішча сялян, іх сацыяльная дыферэнцыяцыя. Асаблівасці правядзення земскай рэформы. Вынікі рэформаў для Беларусі.

Беларусь у перыяд буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый 1905–1907 гг. і Лютаўскай 1917 г. Прычыны рэвалюцый. Выступленні рабочых і сялян. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і яго наступствы для Беларусі. Лагеры ў грамадска-палітычнай барацьбе: асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі, іх праграмныя патрабаванні па нацыянальным, аграрным пытаннях, па пытанні аб уладзе. Дэпутаты ад заходніх губерняў у Дзяржаўнай думе. Праграмныя патрабаванні Беларускай сацыялістычнай грамады. Беларускі нацыянальны рух. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Двоеўладдзе. Дэмакратызацыя арміі. Значэнне рэвалюцыйных падзей для буржуазна-дэмакратычнага развіцця беларускага грамадства.

Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Увядзенне ваеннага становішча. Акупацыя заходняй часткі Беларусі германскімі войскамі. Палітыка нямецкіх улад. Наступствы ваенных дзеянняў. Бежанства. Заняпад сельскай гаспадаркі. Рост антываенных і антыўрадавых настрояў. Беларускі нацыянальны рух.

Культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Фарміраванне беларускай нацыі. Асаблівасці саслоўнага і канфесійнага складу насельніцтва Беларусі. Нацыянальная самасвядомасць. Роля газеты «Наша ніва» ў развіцці культуры Беларусі. Змены ў сістэме адукацыі. Навуковыя даследаванні аб мове, этнаграфіі беларусаў, гісторыі Беларусі (І. Насовіч. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі. Заходнерусізм. М. Каяловіч). Развіццё беларускай літаратурнай мовы і літаратуры. Кірункі творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра (І. Буйніцкі). Жывапіс (К. Альхімовіч, Н. Орда, Н. Сілівановіч, В. Бялыніцкі-Біруля). Развіццё архітэктуры.

Практыкум.

Падагульненне.

V. Беларусь у 1917–1945 гг.
(20 гадзін)

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Рашэнні II Усерасійскага з'езда Саветаў і іх роля ва ўсталяванні новай рэвалюцыйнай улады. Пераход улады ў рукі Саветаў на Заходнім фронце і ў Беларусі. Утварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту. Першыя пераўтварэнні.

Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці ў 1917–1920 гг. Пазіцыя бальшавікоў па нацыянальным пытанні. Скліканне Усебеларускага з'езда, яго рашэнні і роспуск. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (далей – БНР). Дзейнасць Рады БНР. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (далей – ССРБ). Першы Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Абвяшчэнне Літоўскай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Другое абвяшчэнне ССРБ.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (далей – БССР) у гады замежнай ваеннай інтэрвенцыі. Наступленне войск кайзераўскай Германіі. Брэсцкі мір і яго вынікі для Беларусі. Устанаўленне германскага акупацыйнага рэжыму. Барацьба супраць германскіх акупантаў. Польска-савецкая вайна. Устанаўленне польскага акупацыйнага рэжыму і арганізацыя барацьбы з ім. Вызваленне войскамі Чырвонай Арміі тэрыторыі Беларусі ад польскіх інтэрвентаў. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

БССР у гады новай эканамічнай палітыкі (далей – нэп). Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Палітыка «ваеннага камунізму». Увядзенне нэпа і яго ўплыў на пад'ём сельскай гаспадаркі, развіццё прамысловасці, гандлю. Устанаўленне аднапартыйнай сістэмы. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР). Узбуйненні тэрыторыі БССР. Канстытуцыя БССР 1927 г.

БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР і яе вынікі. Погляды на шляхі пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, формы кааперавання сялянскіх гаспадарак. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР: тэмпы, метады і вынікі калгаснага будаўніцтва. Грамадска-палітычнае жыццё. Канстытуцыя БССР 1937 г. Роля Камуністычнай партыі і Саветаў. Палітычныя рэпрэсіі.

Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920–1930-я гг. Асноўныя напрамкі і мерапрыемствы беларусізацыі, яе вынікі і значэнне. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Інстытут беларускай культуры. Утварэнне Беларускай Акадэміі навук. Асноўныя напрамкі і тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў (Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, П. Броўка, М. Лынькоў). Станаўленне беларускага савецкага тэатра (Я. Міровіч, У. Галубок). Тэатральнае і музычнае мастацтва (К. Крапіва, Г. Глебаў, А. Багатыроў). Станаўленне беларускага кіно (Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін). Вядучыя тэмы выяўленчага мастацтва (І. Ахрэмчык, І. Давыдовіч). Архітэктура і скульптура (І. Лангбард, Г. Лаўроў, З. Азгур).

Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця заходнебеларускага насельніцтва. Насаджэнне асадніцтва. Нацыянальна-культурны ўціск. Нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Дзейнасць Таварыства беларускай школы. Стан культуры ў Заходняй Беларусі. Адукацыя. Літаратура (П. Пестрак, М. Танк. Жывапіс: Я. Драздовіч, П. Сергіевіч). Музычнае мастацтва (Р. Шырма).

Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Прычыны і характар вайны. Нападзенне Германіі на Польшчу. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Устанаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Рашэнні Народнага сходу. Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне з БССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Нападзенне Германіі на СССР. Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей. Прычыны адступлення войск Чырвонай Арміі на першым этапе вайны. Устанаўленне нямецка-фашысцкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Акупацыйная палітыка. Палітыка генацыду.

Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Роля Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі ў арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Стварэнне партызанскіх атрадаў. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Асаблівасці разгортвання партызанскага руху ў заходніх раёнах Беларусі. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Партыйнае і маладзёжна-камсамольскае падполле. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму. Калабарацыянізм.

Вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пачатак вызвалення БССР. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Дапамога партызан і насельніцтва Чырвонай Арміі. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі. Воіны-беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Уклад беларускага народа ў перамогу над фашысцкай Германіяй. Вытокі патрыятызму беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Практыкум.

Падагульненне.

## VI. БССР у другой палове 1940-х – 1980-х гг. (12 гадзін)

БССР у 1945–1953 гг. Удзел БССР у заснаванні Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (далей – ААН). Страты, якія прычыніла вайна і фашысцкая акупацыя Беларусі. Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі. Працоўны подзвіг беларускага народа. Паскарэнне тэмпаў індустрыялізацыі БССР. Апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Становішча ў сельскай гаспадарцы і меры па яе аднаўленні. Ажыццяўленне масавай калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР пасля заканчэння вайны. Аднаўленне працы адукацыйных устаноў. Ажыццяўленне ўсеагульнага сямігадовага навучання. Тэма вайны ў беларускай літаратуры (І. Шамякін, М. Лынькоў, І. Мележ). Творчасць Я. Коласа, Я. Брыля, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова. Беларускі тэатр. Музычнае і выяўленчае мастацтва. Выхад БССР на міжнародную арэну. Уключэнне БССР ў склад краін – заснавальніц ААН.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Пераўтварэнне БССР у індустрыяльна развітую краіну. Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Экстэнсіўны характар гаспадаркі. Асаблівасці выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР. Урбанізацыя і яе вынікі. Развіццё сельскай гаспадаркі: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Курс на стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Змяненне ўмоў жыцця насельніцтва. Замаруджванне тэмпаў росту народнай гаспадаркі ў першай палове 1980-х гг. Наспяванне крызісных з’яў у эканоміцы.

Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. Асуджэнне культу асобы Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў гады «адлігі». Частковая рэабілітацыя. Павышэнне ролі працоўных у жыцці грамадства. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі камуністычнай партыі. Роля Саветаў у грамадска-палітычным жыцці краіны.

БССР у другой палове 1980-х гг. Палітыка «перабудовы» і асаблівасці яе правядзення ў БССР. Увядзенне ў краіне галоснасці. Рэфармаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы на альтэрнатыўнай аснове. Страта КПБ манаполіі на ўладу. Пачатак фарміравання шматпартыйнасці. Паглыбленне крызісных з’яў у эканоміцы. Спробы паскарэння

сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне і гаспадарчы разлік. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі на эканамічнае становішча БССР. Пагаршэнне становішча ў сельскай гаспадарцы.

Развіццё адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1950-х – 1980-я гг. Рэформа школы і пераход да абавязковага 8-гадовага навучання. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Пашырэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання. Развіццё вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Інтэграванасць беларускай навукі ў агульнасаюзную. Уплыў грамадска-палітычнага жыцця на беларускую літаратуру. Адлюстраванне гістарычных падзей у творчасці У. Караткевіча. Распрацоўка тэмы вайны ў творах І. Шамякіна, В. Быкава, І. Навуменкі, А. Адамовіча. Жыццёвыя лёсы беларусаў у творчасці І. Мележа. Беларуская паэзія. Новыя з’явы ў беларускай літаратуры ў гады перабудовы. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі.

Практыкум.

Падагульненне.

## VII. Рэспубліка Беларусь у 1991 – пачатку XXI ст.
## (12 гадзін)

Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Рух за нацыянальнае адраджэнне ў Беларусі. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. Усесаюзны рэферэндум па пытанні аб захаванні абноўленага СССР. Закон Вярхоўнага Савета БССР ад 25 жніўня 1991 г. «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР». Прыняцце 19 верасня 1991 г. назвы Рэспубліка Беларусь. Белавежскае пагадненне 8 снежня 1991 г. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст. Рэспубліканскія рэферэндумы 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г., 27 лютага 2022 г., прынятыя на іх змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Асновы дзяржаўнага ладу суверэннай Рэспублікі Беларусь. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Канфесіянальная палітыка дзяржавы. Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь. Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, іх зацвярджэнне на Усебеларускіх народных сходах і рэалізацыя. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны. Галоўныя мэты і асноўныя элементы беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, сродкі яе рэалізацыі і дасягненні. Дзяржаўная маладзёжная палітыка.

Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Прыхільнасць Беларусі прынцыпам Статута ААН. Умацаванне сувязей з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Саюз Беларусі і Расіі. Фарміраванне Еўразійскага эканамічнага саюза. Узаемаадносіны з Еўрапейскім Саюзам, Кітаем і іншымі краінамі свету.

Развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Дасягненні беларускай навукі і яе роля ў фарміраванні інфармацыйнага грамадства. Развіццё сістэмы адукацыі. Літаратура. Адлюстраванне ў мастацтве гістарычнага мінулага беларускага народа. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі.

Практыкум.

Падагульненне.

Праектная дзейнасць (3 гадзіны).

Выніковае падагульненне (1 гадзіна).